Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Сярэдняя школа № 28 г.Магілёва»
Абласны рэсурсны іннавацыйны цэнтр «Фарміраванне сацыяльнай пасляховасці вучняў у інтарэсах устойлівага развіцця»

# УРОК

## ПАДАГУЛЬНЕННЕ І СІСТЭМАТЫЗАЦЫЯ ВЫВУЧАНАГА ПА РАЗДЗЕЛЕ “ФАНЕТЫКА І АРФАЭПІЯ. ГРАФІКА І АРФАГРАФІЯ”

### (беларуская мова, 5 клас)

Лебедзеў Аляксандр Уладзіміравіч,
настаўнік беларускай мовы і літаратуры, вышэйшая кваліфікацыйная катэгорыя

Магілёў 2024

**Мэта і задачы ўрока:**

- паўтарыць і сістэматызаваць веды вучняў па раздзеле “Фанетыка і арфаэпія. Графіка і арфаграфія”, спрыяць выкарыстанню ведаў у паўсядзённым жыцці, правядзенню самааналізу і рэфлексіі асабістых ведаў;
- развіваць кмунікацыйныя кампетэнцыі вучняў, іх арфаграфічную пільнасць, удасканальваць працу ў калектыве, парах, групах;
- садзейнічаць развіццю цікавасці і павагі да роднай мовы, выхаванню чуласці.

<table>
<tr><td colspan="3">Арганізацыйны момант</td></tr>
<tr><td colspan="3">Добры дзень.<br>Пачнём наш урок з усмешкі. Усміхніцеся адзін аднаму, усміхніцеся мне, усміхніцеся нашым гасцям. У кожнага з вас ёсць маленькае сонца. Гэта сонца – дабрыня. Добры чалавека – гэта той, хто любіць людзей і дапамагае ім. А любоў і дапамога саграваюць, як сонца. Я жадаю вам поспехаў у атрыманні ведаў!<br>Дарагія вучні, усю чвэрць вы радавалі мяне сваёй стараннасцю. Настаў час паказаць, што ваша работа не была марнай.<br>Ці глядзелі вы Алімпійскія гульні? (Адказы вучняў.)<br>Да гэтага важнага спаборніцтва спартсмены рыхтуюцца ажно чатыры гады. Нашы прызёры – біятланіст Антон Смольскі і фрыстайлістка Ганна Гуськова – ажно 48 месяцаў ішлі да перамогі.<br>А на сённяшнім уроку перамогу атрымаць я ўжо жадаю вам: справіцеся з маімі заданнямі і пытаннямі – добры настрой і станоўчыя адзнакі. Зычу поспехаў кожнаму!<br>А вы хочаце атрымаць высокія адзнакі? (Адказы вучняў.)<br>Высокія адзнакі – гэты вынік. Як у алімпійца – медаль. Але яны выстаўляюцца толькі тым вучням, якія нешта выканалі.<br>Тое, што неабходна выканаць, вырашыць, называецца задача.<br>Усю чвэрць мы старанна вывучалі розныя арфаграмы беларускай мовы. І сёння ў вас, як у алімпійцаў, фінальнае выступленне. Іменна гэтыя арфаграмы дапамогуць вам<br>не толькі атрымаць высокія адзнакі, а яшчэ карысна ўрок правесці. Дык якую задачу для вы перад сабой паставіце на сённяшнім уроку? Што вы будзеце рабіць, звязанае з арфаграмамі, каб атрымаць высокую адзнаку? Запішыце свае адказы на сцікерах. (Вучні запісваюць.)<br>Калі ласка, агучце свае задачы. (Адказы вучняў.)</td></tr>
<tr><td colspan="3">Актуалізацыя раней вывучанага</td></tr>
<tr><td>ПРЫПАМІНАННЕ 1-2</td><td>Пералічыце вядомыя вам арфаграмы беларускай мовы. Спачатку галосныя. (Адказы вучняў.)<br>Цяпер назавіце зычныя арфаграмы. (Адказы вучняў.)</td><td></td></tr>
<tr><td colspan="3">Вывучэнне і замацаванне новага матэрыялу</td></tr>
<tr><td>РАЗУМЕННЕ</td><td>Закрыйце падручнікі.</td><td></td></tr>
</table>

| | | |
|---|---|---|
| 3-4 | Прывядзіце ўласныя прыклады, калі пішуцца гэтыя арфаграмы і растлумачце іх правапіс. *(Настаўнік дэманструе арфаграмы.)*<br>А зараз пашырым вашы ўменні пры дапамозе арфаграфічных заданняў на сайтах **https://learningapps.org/** | |
| ПРЫМЯНЕННЕ<br>5-6 | Малайцы. Якасна працававаць у вуснай форме вы ўмееце. А як яно будзе на пісьме? Ну што, сябры, папішам крыху!<br>Спачатку вось што запішыце ў сшытку. *(Назвы радкоў э, о, а, я, ь, дз, ц, д, т, ў, у, цц.)*<br>Наступнае заданне такое. Прымяніце арфаграфічнае правіла і запішыце слова ў радок з адпаведнай арфаграмай, ужытай у слове. (Дадзены словы *дрэва, поні, сабака, нясмелы, бульбінкі, дзверы, шэсць, дыск, тэлефон, леў, вусік, жыццё*.)<br>Давайце патрэніруемся, напрыклад, куды напішаце слова *марскі*? А слова *мышшу*? *(Адказы вучняў і гасцей урока.)*<br>Калі ласка, выконвайце заданне. | |
| АНАЛІЗ<br>7 | Адкрыйце падручнік на с.80.<br>У практыкаванні 169 змешчаны верш “Лазня”. Ведаеце значэнне гэтага слова? *(Адказы вучняў.)*<br>Паслухайце верш.<br>А зараз новенькае заданне для вас.<br>Папрацуйце ў парах. Разам удваіх знайдзіце па адным слове на чалавека, у якім нейкая выбраная вамі арфаграма пішацца па адным і тым жа правіле. Прааналізуйце гэтыя словы.<br>Давайце патрэніруемся, якія з гэтых трох слоў можна аб’яднаць у пару: *сліўка, ружы, гнеў*. *(Адказы вучняў і гасцей урока.)*<br>Калі ласка, выконвайце заданне.<br>*(Праверка выканання задання.)*<br>А як вы думаце, якая думку выражае аўтар верша? Чаму ён вам гэта рэкамендуе? *(Адказы вучняў.)* | |
| **Падвядзенне вынікаў урока** | | |
| СІНТЭЗ 8 | Прыйшла пара падвесці вынікі сённяшняга ўрока.<br>Вось вам яшчэ адно заданне. Называецца яно “Інтэрв’ю”. Стварыце пытанне па тэме ўрока і задайце яго нейкаму аднаму адрасату: іх завуць “Галосныя арфаграмы” і “Зычныя арфаграмы”. | |

<table>
<tr><td></td><td>(Выбраць адрасатаў.)<br>Калі ласка, выконвайце заданне.<br>(Адказы вучняў і гасцей урока.)</td><td></td></tr>
<tr><td>АЦЭНКА<br>9-10</td><td>Ну і нарэшце, абгрунтуйце, ці правільна запісаны наступныя словы: група, лімонны, соўс, сказау, тёплы, цвёрды, ночь, верасень, дзевяты, водзічка.<br>(Адказы вучняў.)</td><td></td></tr>
<tr><td colspan="3">Рэфлексія</td></tr>
<tr><td colspan="3">А цяпер звернемся да задач, якія вы ставілі перад сабой на ўрок. Ці дасягнулі іх? (Адказы вучняў праз прымацаванне да дошкі з + і -.)<br>Да якіх вывадаў вы прыйшлі напрыканцы ўрока? (Адказы вучняў.)<br>Якое заданне вам найбольш запомнілася. (Адказы вучняў.)</td></tr>
<tr><td colspan="3">Тлумачэнне дамашняга задання</td></tr>
<tr><td colspan="3">Ну і дамашняе заданне.<br>Абавязкова схадзіце ў лазню ☺ Заставайцеся здаровымі! Не хварэйце!<br>І завядзіце новае хобі: напрыклад, чытайце разумныя кнігі – нават падручнік па беларускай мове. Вучыць родную мову і карыстайцеся её.<br>І яшчэ: мы пачыналі ўрок з успаміну пра Алімпійскія гульні. Гэтае спаборніцтва заўжды завяршаецца салютам. Вазьміце крыху канфеці і па маёй камандзе давайце зробім салют. (Салют.)<br>Усяго добрага!</td></tr>
</table>